■ Нашы дзеці



# Дзевяць дзён без бацькоў, або Урокі самастойнасці

**Майстар-клас па баскетболе, гатаванне канапэ і тэст на прафесію. Гэтымі і іншымі справамі на выхадных займаліся выхаванцы палатачнага ваенна-патрыятычнага лагера «Абаронцы Айчыны» на базе Мінскага гарадскога адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Лідар», што непадалёк ад Ждановічаў. Да падлеткаў завіталі трэнер Аляксандр Куль з сям'ёй, прадстаўнік МНС Віталь Дэмбоўскі, супрацоўнікі сталічнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей і сябры «Клуба львоў».**

Арганізатары прафілактычнай акцыі «Сям'я — тэрыторыя здароўя» зладзілі свята ў «Лідары», каб расказаць падлеткам і моладзі пра здаровы лад жыцця.

*— Мы вырашылі зладзіць майстар-класы з вядомымі спартсменамі і кулінарамі,* — расказаў **Вячаслаў ШЧЭРБА, старшыня праўлення РДГА «Клуб ільвоў»**. *— Як вядома, бацькі найчасцей песцяць сваіх малых і многія хатнія абавязкі выконваюць за іх. А тут яны змогуць нешта зрабіць самастойна.*

26 падлеткаў, якія адпачываюць у лагеры, — незвычайная змена. Усе яны — найлепшыя вучні, што летась неслі пачэсную вахту памяці каля Вечнага агню на плошчы Перамогі. Дзевяць дзён змены яны загартоўваліся, набывалі навыкі самастойнасці і адказнасці за свае паводзіны, жывучы ў палатках.

*— У нашым лагеры існуе камандны склад з кіраўніком змены і начальнікамі каравула. Падлеткі адпрацоўваюць лідарскія якасці, загартоўваюць характар і вучацца дысцыпліне,* — расказаў **начальнік лагера, культарганізатар Палаца дзяцей і моладзі Генадзь ХЛУТКОЎ.** *— Адпрацоўвалі страявую падрыхтоўку, гулялі ў ваенна-спартыўныя гульні «Зарніца» і «Арлёнак», якія імітуюць баявыя дзеянні, выязджалі ў Хатынь і наведвалі роту ганаровага каравула. А на свята Дня Незалежнасці ўсклалі кветкі да Вечнага агню і неслі ганаровую вахту.*



Прадстаўніца цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей на прафарыентаваным майстар-класе давала падлеткам тэсты, каб выявіць іх здольнасці да будучай прафесіі. Яна заўважыла, што пры жаданні хлопцы могуць летам і падпрацаваць. Прадпрыемства «Мінскзеленбуд» і тэрытарыяльны цэнтр пазашкольнай працы ахвотна прымаюць на сезонныя работы падлеткаў да 16 гадоў.

Шар, куб, піраміду і іншыя выявы хлопцы і дзяўчаты ляпілі з кенетычнага пяску на майстар-класе па займальнай псіхалогіі, спрабуючы праз атрыманае зразумець сваё стаўленне да свету.

Паказаць свае спартыўныя здольнасці яны змаглі на баскетбольнай пляцоўцы, дзе пад кіраўніцтвам **Аляксандра КУЛЯ, экс-цэнтравога баскетбольнай каманды «Цмокі-Мінск»,** асвойвалі тэхніку гульні і трохачковыя кідкі.

*— Работа з дзецьмі для мяне задавальненне, — кажа Аляксандр. — Калі ёсць магчымасць падзяліцца вопытам, паказаць ім, што не трэба ўвесь вольны час праводзіць за рознымі мабільнымі прыладамі, — гэта цудоўна. Да таго ж мы выехалі за горад усёй сям'ёй, думаю, усе атрымалі станоўчыя эмоцыі.*

На кулінарным майстар-класе ад шэф-кухароў «Клуба львоў» падлеткі змаглі не толькі навучыцца рабіць «хуткія стравы», але і тут жа падсілкавацца імі. Кавалачкі хлеба, агуркоў, каўбасы, сыру, лімонаў і іншых прысмакаў фарміраваліся ў стройнае канапэ строга па рэцэпту.

Тры гадзіны мерапрыемства праляцелі незаўважна. Самі падлеткі пра дзень, з якога кожны вынес для сябе нешта важнае, казалі з энтузіязмам:

— Усё вельмі спадабалася! А магчымасць пажыць асобна, без апекі бацькоў, і павучыцца самастойнасці — цудоўны вопыт!

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Дажджы і прахалода

**У наступныя дні ў Беларусі захаваецца дажджлівае і халоднае надвор'е, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Гэта будзе абумоўлена змяшчэннем франтальных раздзелаў, што рухаюцца ў бок нашай краіны з Балтыйскага мора. Але максімальная колькасць ападкаў прыпадзе на першую палову тыдня.**

Сёння, у сераду, на пераважнай частцы краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, днём мажлівыя навальніцы. Удзень у асобных раёнах чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 метраў за секунду. Уначы тэмпература складзе 6—12 градусаў цяпла, днём паветра прагрэецца да 14—21.

Заўтра, у чацвер, з ростам атмасфернага ціску аб'ёмы ападкаў зменшацца. Кароткачасовыя дажджы пройдуць толькі ў асобных раёнах краіны, але днём верагоднасць навальніц захаваецца. Уначы будзе 5—11 градусаў цяпла, удзень — 13—20.

Холадна будзе і бліжэй да канца тыдня. Так, ноччу ў пятніцу папярэдне прагназуецца 4—11 градусаў вышэй за нуль, днём — 14—21. У суботу ўначы 6—13 градусаў цяпла, удзень — 16—23. А ўжо ў нядзелю паступова пачне цяплець: 7—14 градусаў ноччу, 18—24 — днём, а на паўднёвым захадзе паветра можа прагрэцца і да 27. Але хаваць парасоны далёка не рэкамендуецца — у асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■ Падрабязнасці

# Страхавы стаж для некаторых грамадзян будзе зменшаны

**29 чэрвеня 2017 года Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь падпісаны Указ №233 «Аб пенсійным забеспячэнні асобных катэгорый грамадзян», які ўступае ў сілу з 1 жніўня гэтага года. Міністэрства працы і сацыяльнай абароны пракаментавала змены, якія ўносяцца гэтым дакументам.**

Мэта ўказа — павысіць узровень пенсійнага забеспячэння грамадзян, якія доўгі час ажыццяўлялі сацыяльна значныя віды дзейнасці, і з гэтай прычыны не змаглі сфарміраваць страхавы стаж, неабходны для прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросце.

Як адзначаюць спецыялісты Мінпрацы і сацабароны, у гэтым годзе неабходны страхавы стаж складае 16 гадоў і будзе і далей паступова павышацца (штогод на 6 месяцаў, да 2025 года) — да дасягнення 20 гадоў.

Указ прадугледжвае магчымасць прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросце пасля дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту пры страхавым стажы не менш за 10 гадоў грамадзянам, якія маюць стаж працы не менш за 40 гадоў у мужчын і 35 гадоў у жанчын.

Таксама пры працягласці страхавога стажу не менш за 10 гадоў будзе прызначацца пенсія па ўзросце грамадзянам, якія доўгі час (не менш за 10 календарных гадоў) праходзілі ваенную службу (службу ў ваенізаваных арганізацыях), але не набылі правы на пенсію ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях і органаў фінансавых расследаванняў». Правы на працоўную пенсію па ўзросце ім будзе давацца пры наяўнасці стажу працы не менш за 25 гадоў у мужчын і 20 гадоў у жанчын.

Указ таксама дае магчымасць уключэння ў стаж працы для прызначэння працоўнай пенсіі перыядаў догляду за інвалідам 1-й групы або дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, а таксама за састарэлымі, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту і якія маюць патрэбу ў пастаянным доглядзе, да дасягнення грамадзянамі, якія ажыццяўлялі догляд, узросту 65 гадоў (для мужчын) і 60 гадоў (для жанчын).

Падрабязнасці можна даведацца на сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Здарэнні

# ЦЯГНІК ПРАТАРАНІЎ АЎТО

**Трагедыя адбылася ў Слоніме, паведамляюць у прэс-службе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Апоўдні да ратавальнікаў паступіла паведамленне аб тым, што на адным з чыгуначных пераездаў адбылося дарожна-транспартнае здарэнне з удзелам грузавога саставу і легкавога аўтамабіля. У машыне засталіся заблакаванымі людзі.**



На месца прыбылі падраздзяленні МНС, якія высветлілі, што пад цягнік трапіў аўтамабіль «Волга» пад кіраваннем мужчыны 1954 года нараджэння. Падчас следавання цераз пераезд пенсіянер не прапусціў таварны састаў. Ратавальнікі дасталі з аўтамабіля двух пасажырак, а таксама цела загінулага кіроўцы. Адна з жанчын пазней памерла ў бальніцы. Абставіны здарэння ўдакладняюцца.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■ Братэрства

# Перакладчыцкі інстытут Камрана Назірлі

**У Азербайджане прыкладаецца шмат намаганняў для знаёмства з беларускай літаратурай.**

У Беларусі і Азербайджана шмат агульнага ў памкненнях да фарміравання прасторы цікаўнасці нацыянальнага чытача да літаратур розных краін. У Мінску выходзяць кнігі азербайджанскіх аўтараў у перакладзе на беларускую мову. У Баку — наадварот: проза і паэзія беларускіх пісьменнікаў гучыць па-азербайджанску.

Асабліву руплівасць праяўляе празаік, драматург і перакладчык Камран Назірлі. Ён пераклаў на сваю родную мову кнігу лаўрэата Нобелеўскай прэміі Святланы Алексіевіч «У вайны не жаночы твар», аповесць Анатоля Матвіенкі «Галоўная таямніца КДБ», а таксама — апавяданні Алеся Бадака, Георгія Марчука, якія надрукаваны ў перыядычных выданнях Азербайджана. Зараз з удзелам Камрана Назірлі бакінскае выдавецтва «Мутарджым» распачынае праект па выданні серыі кніг «Сучасная беларуская літаратура». Першымі пабачаць свет зборнікі апавяданняў Алеся Бадака, Георгія Марчука, раман Мікалая Чаргінца «Сыны».

І беларускі бок не застаецца ў даўгу. Апошнім часам пабачылі свет на беларускай мове кнігі паэзіі Чынгіза Алі аглу, Лейлы Алівай, зборнік казак і вершаў для дзяцей «Базгулаг і поры года» Севіндж Нурукызы.

Стварэнню такога шырокага прасцягу для прапаганды беларускай літаратуры ў свеце сёння спрыяе менавіта творчая ініцыятыва такіх людзей, як Камран Назірлі. У Таджыкістане сучасную беларускую прозу і паэзію прапагандуе выдавец і літаратар Ато Хамдам. У Казахстане — літаратуразнаўца Святлана Ананьева. У Малдове — публіцыст Юрый Іваноў. Ва Украіне — паэт, перакладчык, дзіцячы пісьменнік Аляксей Кананенка. У Туркменістане — празаік і паэт Агагельды Аланазараў, малады літаратар Максат Бяшымаў. Руплівасць гэтых сяброў часам роўная праца іншых інстытутаў.

**Мікола БЕРЛЕЖ**


БПС-СБЕРБАНК

**Уважаемые клиенты!**

С 05.07.2017 ОАО «БПС-Сбербанк» устанавливает следующий размер процентов по действующим договорам в белорусских рублях срочного банковского депозита «Доверяй +», заключенным до 01.04.2016:

| Размер процентов (годовых) |
|---|
| 3,5 |

Установленный размер процентов будет применен к депозиту с 05.08.2017.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»